УДК 37(476)(091) “17/19”

ФУНДУШ ГІЛЬЗЕНАЎ-ШАДУРСКІХ У СПРАВЕ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ ВА УСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

канд. гіст. навук, дац. А.Ф. САМУСІК
(Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск)

Разглядаецца праблема, якая дагэтуль застаецца па-за рамкамі прац айчынных і замежных даследчыкаў, – гісторыя складвання і выкарыстання ў асветніцкай справе канца XVIII – пачатку XX стагоддзя буйнейшага ў Беларусі фундуша Гільзенаў-Шадурскіх. Аналіз гістарыяграфіі паказаў недастатковую вывучанасць мецэнацтва ў Рэчы Паспалітай. З улікам гэтага ў рабоце прасочаны працэс складвання фундуша на фоне палітычна-эканамічнага жыцця беларускіх зямель у азначаны перыяд. Аналіз архіўных крыніц дазволіў аўтару ўсебакова разгледзіць напрамкі размеркавання сродкаў, іх уплыў на стан асобных навучальных устаноў. У сваю чаргу вывучэнне эвалюцыі адносін вучылішчных улад да прыватнага мецэнацтва дало магчымасць вызначыць спецыфіку развіцця сістэмы адукацыі ў рэгіёне, а таксама фактары, паспрыяўшыя яе паступовай уніфікацыі з агульнаімперскай школьнай мадэллю. Прадметам асобнага даследавання сталі праекты графаў Шадурскіх па пераўтварэнні Асвеі ў буйны асветніцкі цэнтр, што цалкам адпавядала агульным настроям мясцовага грамадства па актывізацыі тут культурнага жыцця ў цэлым і паляпшэнні якаснага ўзроўню сярэдняй ды вышэйшай адукацыі ў прыватнасці. Адзначана неабходнасць адраджэння фундуша Гільзенаў-Шадурскіх як адметнай дабрачыннай акцыі міжнароднага ўзроўню.

Беларускія землі ў складзе ВКЛ уяўлялі сабою даволі складанае і стракатае адміністрацыйнае ўтварэнне. З аднаго боку, тут меўся дастаткова лагічны падзел на ваяводствы і паветы. З іншага – па ўсёй тэрыторыі Беларусі былі раскіданы паўсамастойныя прыватныя ўладанні (ардынацыі, графствы і інш.). У выніку славутая айчынная “шляхецкая анархія”, якая найбольшым чынам расквітнела ў XVIII стагоддзі, рабіла цэнтральную ўладу часам простым назіральнікам за падзеямі ўнутры рознакаляровай магнацка-шляхецкай Рэчы Паспалітай. Пры гэтым у гістарычнай навуцы, на жаль, склалася пераважна адмоўнае стаўленне да празмернага свавольства тутэйшай правячай эліты. Зразумець гэта не цяжка – менавіта яно ў рэшце рэшт прывяло краіну да гвалтоўных падзелаў і гібелі. Разам з тым яшчэ адным вынікам слабой улады манарха Рэчы Паспалітай было складванне магутных магнацкіх радоў, якія па сваёй заможнасці не саступалі нават некаторым з каралеўскіх дамоў Еўропы. Шыкоўныя палацава-паркавыя комплексы, дзе амаль без перапынку адбываліся шумныя ды вясёлыя балы і паляванні – вось яшчэ адна адметная прыкмета гісторыі Беларусі XVIII стагоддзя. Якраз айчынныя магнацка-шляхецкія колы складалі тое асяроддзе, адкуль выходзілі найбольш вядомыя прадстаўнікі тагачаснай навукі, адукацыі і мастацтва. У сусветную культурную скарбонку назаўсёды ўпісаны імёны Францішкі Уршулі Радзівіл, Юльяна Урсына Нямцэвіча, Міхала Клеафаса Агінскага і інш. Дзякуючы менавіта ім асобныя беларускія мястэчкі і вёскі пераўтвараліся ў вядомыя на ўсю Еўропу асветніцкія цэнтры – “Сядзібы муз”, “Паўночныя Афіны” і г. д.

Неад’емнай старонкай жыцця асветных арыстакратаў таго часу было і мецэнацтва – менавіта на іх сродкі па ўсёй Беларусі ўзводзілі храмы, адкрывалі школы ды шпіталі. Але якраз гэты аспект паўсядзённага жыцця айчыннай правячай эліты даследаваны параўнальна слаба, з акцэнтаваннем увагі на дабрачыннай дзейнасці манархаў і найбольш славутых айчынных асветнікаў [1, с. 101 – 105; 2, с. 62 – 66]. На жаль, у поўнай меры датычыцца гэта і даследаванняў польскіх навукоўцаў [3, с. 263 – 264; 4, с. 50 – 52]. У цэлым гісторыя айчыннага мецэнацтва пераважна закранаецца зараз у дачыненні толькі да славутых магнацкіх радоў, але пры такім падыходзе па-за межамі навуковых даследаванняў аказаліся прадстаўнікі менш вядомых шляхецкіх сямей. Так, нягледзячы на тое, што фундатарская дзейнасць тых жа Гільзенаў была надзвычай актыўнай і дала шмат карыснага ў тым ліку і паўночна-ўсходняй Беларусі, у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі адзначана, што іх дабрачынныя намеры так і засталіся “не рэалізаваны” [5, с. 366].

Самі Гільзены выводзілі сябе са старадаўняга рыцарскага роду Экельнаў з Мархіі (Вестфалія), асеўшых у Прыбалтыцы ў першай палове XVI стагоддзя (Янкель зэн дэ Экельн у 1533 – 1534 гг. быў адным з камандзіраў Дынабурга). Істотныя змены ў іх гісторыі адбыліся ў час Паўночнай вайны, калі сын канцлера Курляндыі Яна Францішка – Ежы Канстанцін Гільзен дэ Экельн перайшоў на службу да караля Рэчы Паспалітай Аўгуста II, ад якога атрымаў пасаду падкаморыя надворнага і спустошанае казакамі ды калмыкамі марыенгаўзенскае староства [6, с. 10 – 16]. Росквіт жа роду прыйшоўся на час жыцця яго сыноў: смаленскага біскупа, кавалера ордэна Белага Арла Ежы Мікалая Гільзена і яго малодшага брата – старосты Марыенгаўзенскага і браслаўскага, кашталяна інфлянцкага, мінскага ваяводы, маршалка Трыбунала ВКЛ і таксама кавалера ордэна Белага Арла Яна Аўгуста Гільзена. Багацці, атрыманыя ад бацькі, яны вельмі значна прымножылі, аддаючы грошы пад працэнты прадстаўнікам вядучых магнацкіх радоў Беларусі. Першымі ў іх спісе стаялі князі Сапегі, якія разам павінны былі братам Гільзенам звыш 400 тыс. злотых. Адзін з іх – канцлер ВКЛ Ян Фрыдэрык Сапега – высока цаніў “вучонасць”

сваіх крэдытораў. Ён называў іх уласнай “Інфантэрыяй” (“пяхотай”, скажонае вытворчае ад родных ім Інфлянт) і на сейме 1783 года нават дабіўся для братоў пасад регентаў канцылярый вялікіх Кароны (Ежы Мікалай) і ВКЛ (Ян Аўгуст). Апошні, дарэчы, менавіта якраз з дапамогай канцлера заняў вышэйпаралічаныя пасады. Што ж датычыцца Ежы Мікалая, то смаленскім біскупам ён стаў у 1745 годзе дзякуючы пратэкцыі іншага высакароднага даўжніка – каад’ютара віленскага Юзафа Сапегі. Ён жа, да таго ж не здольны выкупіць закладзеныя Гільзенам маёнткі, быў вымушаны прадаваць іх братам з улікам пагашэння шматлікіх даўгоў – у 1739 годзе такім чынам памянялі ўласніка Германовічы, а праз дзесяць год і вялізнае ды прыбытковае Асвейскае графства (зараз у Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці) за 1 мільён злотых перайшло да новага гаспадара. Асвея, дарэчы, была набыта спецыяльна пад рэзідэнцыю Е.М. Гільзена (знаходзілася на тэрыторыі біскупства), але ён больш часу праводзіў у Варшаве, а таму менавіта Я.А. Гільзен здолеў не толькі заняць адказныя пасады ў ВКЛ, але і стаць адным з буйнейшых землеўласнікаў паўночна-ўсходняй Беларусі (валодаў звыш 10 тыс. прыгоннымі сялянамі) [7, с. 128 – 129]. Трэба таксама адзначыць і тое, што браты Я.А. і Е.М. Гільзены ўвайшлі ў гісторыю яшчэ і ў якасці таленавітых літаратараў. Мінскі ваявода дасканала ведаў антычную літаратурную спадчыну (захапляўся Цыцэронам) і з’яўляўся шчырым патрыётам сваёй “малой Радзімы”. Менавіта ён стаў аўтарам першай гістарычнай хронікі “Інфлянты ў даўніх сваіх і разнастайных аж да нашага веку падзеях і рэвалюцыях” (1750), а таксама складальнікам найбольш ранняга гербоўніка прыбалтыйскай шляхты, які ў якасці 2-га тома быў далучаны да хронікі. У сваю чаргу смаленскі біскуп з’яўляўся аўтарам цэлага шэрага рэлігійных і гістарычных твораў: “Польскі катэхізіс” (1761), “Вайна духоўная Ваўжынца Скуполі” (1741), “Гістарычнае апісанне звычаяў першых хрысціян адпаведна Клаўдзію Флеру” (1746) [8, с. 130].

Шырокую вядомасць і павагу атрымаў Я.А. Гільзен за сваю мецэнацкую дзейнасць. У гэтай сферы ён блізка сыйшоўся з кашталянам полацкім і троцкім, ваяводай мсціслаўскім графам Канстанцінам Людвікам Плятэрам, які валодаў суседнім з Асвеяй мястэчкам Краслаў (зараз на тэрыторыі Латвіі) – пасля смерці сваёй першай жонкі з роду Солтанаў ён нават ажаніўся на яго дачцы Канстанцыі Плятэр. Менавіта дзякуючы іх аб’яднаным намаганням у паўночна-ўсходняй Беларусі актывізавалася мураванае культавае будаўніцтва. Дзеля гэтага імі сюды былі запрошаны вядучыя тагачасныя архітэктары Рэчы Паспалітай (Ян Глаўбіц, Людвіг Грынцэвіч, Антоні Парака). Першы з іх – славуты заснавальнік школы “віленскага барока” – узвёў на сродкі мінскага ваяводы шыкоўны барочна-ракайльны Юр’еўскі касцёл у дамініканскім кляштары ў фальварку Забелы каля в. Валынцы (зараз у Верхнядзвінскім раёне). Другі ў Друі (зараз у Браслаўскім раёне) ажыццявіў рэстаўрацыю Троіцкага касцёла бернардзінскага кляштара, а таксама пабудаваў тут кляштар дамініканцаў з касцёлам св. Антонія [9, с. 236 – 240, 293 – 298]. Што датычыцца А. Паракі, то гэты паўночнаітальянскі дойлід увогуле стаў прыдворным архітэктарам як Гільзенаў, так і Плятэраў. Па заказу апошніх у Краславе ён пабудаваў ратушу, радавую бібліятэку-архіў, а таксама рэзідэнцыю інфлянцкага біскупа. А Асвею ўвогуле пачаў, па жаданні гаспадара, пераўтвараць у “ідэальны горад”. У выніку шырокамаштабных горадабудаўнічых работ тут з’явіліся новыя жылыя кварталы з мураванай забудовай. У цэнтры ж мястэчка ўзвялі прасторны гасціны двор. Яго з’яўленне было абумоўлена тым, што праз Асвею ў тыя часы праходзіў ажыўлены гандлёвы шлях з Расіі ў Ліфляндыю, Літву і Польшчу. Да таго ж двойчы ў год (2 мая і 28 чэрвеня) тут адбываліся буйныя кірмашы, якія, акрамя іншага, карысталіся папулярнасцю сярод аматараў конегадоўлі [10, с. 137]. Запрасіў сюды Я.А. Гільзен з Варшавы і манахаў ордэна місіянераў – яны прыбылі ў Асвею ў канцы 1750-х гадоў і разам са службай у часовым драўляным храме распачалі дабрачынную дзейнасць. На грошы гаспадара мястэчка яны адчынілі тут 2 пачатковыя парафіяльныя школы для юнакоў (штогод да 25 выхаванцаў) і дзяўчат (штогод да 15 выхаванак). Акрамя таго, ужо ў 1759 годзе А. Паракай былі завершаны работы па ўзвядзенню мураванага шпіталя. Гэты будынак ацалеў да нашых дзён і ўяўляе сабою 1-павярховую П-падобную пабудову на высокім цокалі пад 2-схільным дахам [11, с. 162].

На жаль, рэалізаваць усе свае задумы наконт Асвеі Я.А. Гільзен не паспеў. У лютым 1767 года ён памёр у Данцыгу. Згодна завяшчанню ўся маёмасць перайшла да яго нашчадкаў: малодшага сына – генерал-маёра войск каронных Юстыніяна, які атрымаў староства марыенгаўзенскае, і яго старэйшага брата – Юзафа Ежы, стаўшага графам Асвейскім. Прычым, згодна апошняй волі Я.А. Гільзэна, палова ўсіх прыбыткаў павінна была ісці на дабрачынныя мэты (пашырэнне асветы і медыцыны) [12, с. 129]. Трэба адзначыць, што яго сыны ў маладосці атрымалі выдатную адукацыю. Вядома, напрыклад, што сярод іх хатніх настаўнікаў быў віленскі езуіт Караль Езерскі, які выкладаў ім латынь і працы Арыстоцеля, а пад наглядам славутага айчыннага педагога езуіта Караля Вырвіча ў 1751 – 1757 гадах браты здзейснілі замежнае вандраванне, у час якога праходзілі курсы прыродазнаўчых, філасофскіх і юрыдычных навук ва ўніверсітэтах Францыі, Італіі, Бельгіі, Галандыі і Германіі [13, с. 42]. Пасля ж вяртання на Радзіму, дзякуючы вялізнаму багаццю, а таксама ўласнаму розуму, яны зрабілі хуткую кар’еру. Так, Юзаф Ежы Гільзен ужо ў 18 год атрымаў званне каралеўскага пажа і шамбеляна, а ў далейшым стаў таксама браслаўскім старостай, кашталянам інфлянцкім, ваяводай мінскім (а затым і мсціслаўскім), маршалкам Трыбунала ВКЛ, кавалерам ордэнаў Белага Арла і св. Станіслава. Працягваў ён і грашовыя аперацыя свайго бацькі – у 1765 годзе гаспадар Асвеі пазычыў новаму каралю Станіславу Аўгусту ажно 5 тыс. дукатаў, а таксама рэгулярна фінансаваў знакамітага Караля Станіслава Радзівіла Пане Каханку. Уваходзячы ў

бліжэйшае каралеўскае акружэнне ён рашуча выступаў за правядзенне кардынальных рэформ дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. У маі 1766 года Ю.Е. Гільзэн нават прадставіў манарху ўласны праект рэформ: адмена ліберум вета, стварэнне муніцыпальнай міліцыі, секулярызацыя асветніцкай справы, стабілізаванне грашовага абарачэння, будаванне шырокай сеткі дарог ды каналаў, стварэнне мануфактур і ўласнага гандлёвага флоту, запрашэнне іншаземцаў з гарантыяй ім "імунітэту і прывілеяў", пашырэнне правоў мяшчан, замена паншчыны на чынш ды натуральны аброк, адкрыццё сельскагаспадарчай акадэміі, куды б дасылалі сялян з усіх ваяводстваў і інш. У 1783 годзе ён таксама напісаў панегерычную працу "Memoire sur le caractere du roi de Pologne", дзе ўсхваліў дабрадзейнасць караля Станіслава Аўгуста. Публічна Ю.Е. Гільзэн прадставіў яе ў Парыжскім ліцэі – "Газета Варшаўская" з гэтай нагоды адзначала: "Чытаў сваю мудрую дысертацыю і шматлікіх французаў уразіў" [14, с. 131].

У Асвеі пры ім была здзейснена адна з найбольш прыцягальных мараў яго бацькі – у 1782 годзе пабудаваны шыкоўны палац. На адной восі тут размяшчаліся тры асноўныя 2-павярховыя аб'ёмы, па баках ад якіх знаходзіліся выступаючыя наперад вуглавыя флігелі. Усе яны злучаліся паміж сабою 2-павярховымі галерэямі, дзе першы ўзровень меў выгляд адкрытай аркады, а другі быў удала ўпісаны ў агульную анфіладу парадных пакояў. Планіроўка палаца была падпарадкавана дакладнай схеме – у ім мелася 4 парадныя ўваходы, што адпавядала порам года; 12 асноўных унутраных пераходаў (па колькасці месяцаў); 52 тыдні ў годзе вызначылі колькасць у сядзібе залаў і пакояў; вокнаў жа ў рэзідэнцыі, зразумела, налічвалася 365. Галоўны парадны пакой палаца – "блакітная" зала – быў аздоблены ў ракайльным стылі Людовіка XV і займаў увесь цэнтральны аб'ём будынка. Не менш прадстаўнічае аздабленне атрымалі таксама сталовая, некалькі вялікіх і малых салонаў, бібліятэка, кабінет і будуар. У адным жа з вуглавых карпусоў на абодвух узроўнях размяшчаўся зімовы сад з пальмамі, цытрусавымі дрэвамі і інш. [15, с. 175 – 176]. Рэзідэнцыя Ю.Е. Гільзена знаходзілася ў глыбі вялікага парка, які займаў тэрыторыю да 30 га. У яго стварэнні браў удзел рускі ландшафтны архітэктар А.П. Какорынаў, які распрацаваў схему размяшчэння алей і каналаў. Менавіта апошнія разам з сістэмай прамавугольных ставаў па перыметры ахоплівалі цэнтральную частку комплексу, пераўтвараючы яе ў штучны востраў. Узровень вады тут кантралявала спецыяльная дамба са шлюзамі, упрыгожаная зверху дэкаратыўным драўляным млыном. У ставах пастаянна пражывала некалькі калоній лебедзяў. Палац Гільзенаў пры гэтым дзіўным чынам адлюстроўваўся ў воднай паверхні. Трапіць да яго можна было па шырокай цэнтральнай алеі, якая пранізвала парк і праз арачны мост выводзіла да вялізнага параднага зялёнага партэра, які размяшчаўся перад уваходам у рэзідэнцыю. З адваротнага боку палаца быў разбіты буйны кветнік. Побач з ім знаходзіўся сонечны гадзінік – паляна з 12 ліпамі, высаджанымі па крузе (жадаючы даведацца аб часе станавіўся ў яе цэнтр і сачыў за ўласнай ценню). У самім парку меліся шматлікія "антычныя" скульптуры, дэкаратыўныя скамейкі і масткі. На штучна зробленых выспах і астравах знаходзіліся альтанкі. Унікальнай з'явай для айчыннага паркавага мастацтва была наяўнасць тут 2 "кратэраў вулканаў", якія надавалі ўсяму ансамблю рамантычны адбітак. У глыбіні парку таксама знаходзіўся штучны ўзгорак "Сабачае кладзішча" з помнікам сабаку, які выратаваў жыццё маленькага дзіцяці, якое выпала з лодкі ў возера. З боку ад палаца была пракладзена кальцавая гравійная алея з 2 мастамі – летам тут праходзілі аматарскія скачкі. Акрамя рэгулярнага парку ў склад комплексу ўваходзіў і пейзажны лясны масіў у 10 гектараў, афармлены "пад натуральную прыроду". Яго галоўнай адметнасцю быў звярынец у выглядзе вялізнай ямы, падзеленай на вальеры [16, с. 116 – 118].

Такім чынам, відавочна, што рэзідэнцыя ў Асвеі не саступала лепшым аналагічным коплексам у Рэчы Паспалітай. Разам з тым сам Ю.Е. Гільзен так і не здолеў як след нацешыцца ею. Яшчэ ў 1781 годзе ён моцна захварэў, а ў жніўні 1786 года ў час замежнага вандаравання памёр у 50-гадовым узросце ў Рыме. Пры гэтым непасрэдных нашчадкаў пасля яго не засталося: адзіны сын, Ян Ежы, памёр у дзяцінстве, а жонка Тэрэза з роду Патоцкіх сыйшла да аднаго з лідараў таргавічан, генерал-паручніка Шымана Касакоўскага, войскі якога спустошвалі маёнткі Гільзенаў яшчэ ў час Барскай канфедэрацыі. Апошнім прадстаўніком роду Гільзенаў заставаўся сын рана памершага Юстыніяна, Ідзій, які, аднак, згодна сведчанню сучаснікаў, "быў ідыётам" [17, с. 26]. Менавіта таму, згодна завяшчанню (складзена 30 мая 1781 г., афіцыйна абвешчана 29 жніўня 1786 г.), уся нерухомая маёмасць Ю.Е. Гільзена (Асвейскае графства, буйны маёнтак Пельмонт у Себежскім павеце з некалькімі мануфактурамі і 13 тыс. прыгонных сялян агульным коштам у 500 тыс. руб. срэбрам) павінна была перайсці да яго стрыечнага брата – графа Казіміра Канстанціна Плятэра. Апошні, аднак, у гэты час з'яўляўся членам Пастаяннай Рады Рэчы Паспалітай і ва Усходняй Беларусі бываў толькі наездамі, а таму асабіста не рашыўся прыняць ад свайго сваяка такі "падарунак" [18, с. 666 – 667]. Тым больш што ў завяшчанні Ю.Е. Гільзена быў прадубліраваны запіс з "апошняй волі" яго бацькі наконт абавязковага вызвалення ўсіх тутэйшых сялян ад прыгону і выдзялення штогод да паловы даходаў на ўтрыманне шпіталяў, "распаўсюджванне навук ды выхаванне збяднелых дзяцей" (апекуном фундуша абвяшчаўся кароль Станіслаў Аўгуст) [19, с. 393]. Такім чынам, было відавочна, што на наступнага ўладара Асвеі ды Пельмонта ўскладваліся сур'ёзныя абавязкі, якія К.К. Плятэр быў проста не ў стане ажыццявіць (акрамя іншага неабходна было яшчэ і прыняць расійскае грамадзянства). У выніку ён прыняў рашэнне перадаць іх ва ўласнасць сям'і Шадурскіх (кліенты Плятэраў на

працягу некалькіх пакаленняў). Пры гэтым трэба адзначыць, што дадзены шляхецкі род паходзіў з Любельскага ваяводства (з Шадурак каля Наленчова), але здаўна асеў у Інфлянтах і цэлы шэраг яго прадстаўнікоў нават увайшлі ў гісторыю – палкоўнік каралеўскі Мікалай Шадурскі служыў камендантам замка ў Рэчыцы ў час вайны са Швецыяй у 1600 – 1602 гадах, а Стэфан Шадурскі – займаў пачэсную пасаду асабістага сакратара Жыгімонта III Вазы [20, с. 197].

Пры гэтым выбар К.К. Плятэра быў абумоўлены найперш тым, што сястра Яна Аўгуста Гільзэна, Караліна Ядвіга, была замужам за падстаростай інфлянцкім Францыскам Янам Шадурскім, і такім чынам яго сын Станіслаў прыходзіўся Ю.Е. Гільзену таксама стрыечным братам. Ды і для выканання дабрачынных артыкулаў завяшчання гэтая кандыдатура падыходзіла ідэальна. Па-першае, мела месца асабістае знаёмства з Гільзэнамі – Ян Аўгуст фінансаваў яго навучанне ў славутым парыжскім калегіуме св. Людовіка Вялікага, а ў свіце Юзафа Ежы ён выконваў абавязкі місьёнаржа дворскага (капелана). Па-другое, С. Шадурскі з'яўляўся вядомым тагачасным філосафам і пэўны час нават выкладаў у Віленскай езуіцкай акадэміі [21, с. 392]. На жаль яго смерць у 1789 годзе перакрэсліла гэтыя планы, а гільзенаўскія маёнткі ў рэшце рэшт дасталіся шамбелянам каралеўскім Ігнацію і Юзафу Шадурскім (сыны брата Станіслава – харунжага інфлянцкага Яна), якія паабяцалі выконваць усе азначаныя ў завяшчанні абавязкі і клапаціцца аб далейшым развіцці дабрачыннай ды асветніцкай справы ў паўночна-ўсходняй Беларусі [22, с. 390 – 391]. Трэба адзначыць, што такі паварот падзей паспрабавалі аспрэчыць прадстаўнікі згаданага вышэй Ідзія Гільзена, але 25 верасня 1796 года Полацкі Сумленны суд пацвердзіў правамоцнасць завяшчання (сам Ідзій памёр у 1800 годзе, не пакінуўшы нашчадкаў) [23, арк. 16 – 16адв].

Першапачаткова прыбыткі з маёнткаў Ю.Е. Гільзена былі размеркаваны паміж Полацкім езуіцкім калегіумам (55 штогадовых стыпендый збяднелым вучням) і Краслаўскай каталіцкай духоўнай семінарыяй (дадатковае фінансаванне ў памеры 1,3 тыс. руб. срэбрам штогод). Аднак нельга было казаць, што братоў-мецэнатаў цалкам задавальняла падобнае расходванне дабрачынных сродкаў – неаднаразова імі ўздымалася пытанне аб адкрыцці ў краі новых навучальных устаноў. Так, як толькі стала вядома аб хуткім закрыцці ваенных вучылішчаў у Вільні і Гродна ў Пецярбург было накіравана ў 1805 годзе хадайніцтва аб заснаванні ў Асвеі кадэцкага корпуса. Але дадзеную прапанову адвергла як кіраўніцтва Віленскай навучальнай акругі (спадзявалася атрымаць фундуш для ўласных патрэб), так і міністры ўнутраных спраў ды народнай асветы (не падабалася аддаленасць мястэчка) [24, арк. 100 – 111].

Пры гэтым дзяленне гільзенаўскага фундуша паміж езуітамі і місіянерамі таксама не задавальняла чыноўнікаў у Вільні, бо пры такім раскладзе грошы ішлі ў непадкантрольныя ім навучальныя ўстановы. У выніку ў 1808 годзе Віленская камісія па фундушах узбудзіла справу супраць стаўшага ў Расійскай імперыі стацкім саветнікам і маршалкам шляхты Віцебскай губерні Ю. Шадурскага (брат Ігнацій у гэты час ужо памёр) і выклікала яго на сваё паседжанне. Апошні, аднак, разумеючы рэальную пагрозу страты фундушавых сродкаў, узамен фінансавання полацкіх езуітаў у гэтым жа 1808 годзе заснаваў канвікт для збяднелай моладзі пры Забяльскім павятовым вучылішчы (знаходзілася ў згаданай вышэй в. Валынцы). Штогод тут утрымлівалася каля 50 выхаванцаў, для якіх у кляштары арандавалася 2 асобных будынкі, а таксама наймаліся дадатковыя настаўнікі сучасных замежных моў і танцаў. На сродкі фундатара канвіктарам набывалася адзенне, харчаванне, кнігі, школьныя прылады (папера, чарнілы, алоўкі, фарбы), а таксама ўсё тое, што яны "по бедности своей не в состоянии иметь собственное" [25, арк. 1 – 4]. Нармальнае функцыянаванне канвікта забяспечвалі 6 слуг з прыгонных сялян Ю. Шадурскага. Акрамя таго, пры неабходнасці ён наймаў дадаткова рамеснікаў, пераплётчыка і доктара – "до распоряжения которыми училище не смеет даже касаться" (за выключэннем апошняга). Асобныя сродкі ішлі і на паляпшэнне вучэбна-матэрыяльнай базы самой дамініканскай школы – было набыта абсталяванне для фізічнага і хімічнага кабінетаў, папаўнення бібліятэкі, калекцый нумізматыкі ды мінералаў [26, арк. 100]. За расходаваннем сродкаў і належным утрыманнем інтэрната сачыў прызначаны Ю. Шадурскім "дворянин благонравный", а за тлумачанне канвіктарам усяго "нужного по учебным предметам" адказвала некалькі вучняў старэйшых класаў, якія таксама абіраліся графам. У цэлым жа на дадзеную навучальную ўстанову штогод Ю. Шадурскі расходаваў каля 5 тыс. руб. срэбрам, а таму палічыў прэтэнзіі Вільні беспадстаўнымі і на слуханне сваёй справы ў Вільню не паехаў. Трэба адзначыць, што пэўная рацыя ў яго паводзінах безумоўна была, бо ён і так з'яўляўся буйнейшым мецэнатам у межах Віленскай навучальнай акругі. Ды і стаўленне кіраўніцтва апошняй да асветніцкай дзейнасці дамініканцаў у Валынцах было вельмі станоўчым. Тутэйшая школа мела 3 класы з 6-гадовым тэрмінам навучання, 6 настаўнікаў, каля 80 выхаванцаў і лічылася адной з лепшых у рэгіёне. Пацверджаннем апошняга стала наданне ёй імператарскім указам у 1811 годзе статусу 6-класнай гімназіі – першы выпадак у дачыненні да ордэнскіх публічных школ у Беларусі [27, арк. 1 – 3].

У Вільні, аднак, былі вельмі незадаволены самастойным распараджэннем фундушам Ю. Шадурскім. Падобнага меркавання прытрымліваўся і куратар навучальнай акругі кн. А. Чартарыйскі, які ў канцы 1810-х гадоў распачаў захады па ўдасканаленню арганізацыі школьнай справы ў цэлым і размеркаванні фінансаў у прыватнасці. У выніку Віленская фундушавая камісія палічыла неабходным узяць кантроль за размеркаваннем прыбыткаў з былых маёнткаў Ю.Е. Гільзена пад уласны кантроль, а таму ў 1818 годзе

наклала на іх арышт. У адказ на такі крок улад Ю. Шадурскі распрацаваў новы план выкарыстання фундушавых сродкаў. Трэба адзначыць, што пасля выгнання езуітаў у 1820 годзе за межы Расійскай імперыі і закрыцця Полацкай акадэміі ў адукацыйнай справе ўсходняй Беларусі ўзнікла "свабодная ніша", якую імкнуліся запоўніць іншыя манаскія ордэны. Пры падтрымцы гаспадара Асвеі ў канцы 1821 года літоўскі правінцыял дамініканскага ордэна Цяцерскі звярнуўся да міністра народнай асветы князя А. Галіцына з прапановай адкрыць на месцы Забяльскай дамініканскай гімназіі акадэмію з багаслоўскім, філасофскім і філалагічным факультэтамі. На жаль, гэты праект не быў падтрыманы ў Пецярбургу, а права на заснаванне ў рэгіёне вучылішча з курсам навук, набліжаным да ліцэя, было прадастаўлена піярам, якія адчынілі яго ў Полацку [28, арк. 1 – 15].

Правал ідэі заснавання Забяльскай даміканскай акадэміі зноў востра паставіў пытанне наконт далейшага лёсу фундуша Ю.Е. Гільзена. У 1823 годзе было вырашана, што на асветніцкія справы ў далейшым будзе выдзяляцца 4/7 фундуша, на ўтрыманне шпіталяў ды прытулкаў Прыказам грамадскага апекавання – 2/7, а на падтрымку вызваленых ад прыгону гільзенаўскіх сялян – 1/7 [29, с. CXLV]. Разам з тым такое дзяленне сродкаў выклікала вялікія пярэчанні і неўзабаве фундуш быў падзелены інакш: 2/5 – на асвету, а астатняе – "на богоугодные предметы". Але толькі далейшыя перамовы Вільні і Пецярбурга прывялі да дасягнення кампрамісу. У 1824 годзе было вынесена агульнае рашэнне аб тым, што палова прыбыткаў з маёнткаў Ю.Е. Гільзена павінна ісці на "поощрение наук и художеств, воспитание юношества бедных дворян", а астатнія грошы аддавацца Прыказам грамадскага апекавання на "постройку новых и улучшение существующих госпиталей, пособие бедным разорённым и неимущим, находящимся в деревнях" [30, арк. 18].

У адказ на гэта Ю. Шадурскі ў сярэдзіне 1820-х гадоў прапанаваў Міністэрству народнай асветы ўвесь фундуш сканцэнтраваць у Асвеі, дзе адкрыць "Институт графа Гильзена", у якім бы адукацыю атрымлівалі: "дети обоего пола бедных дворян католического вероисповедания". Для хлопчыкаў, ад якіх патрабавалася пры паступленні прад'явіць "свидетельство о дворянстве и о бедности", тут меркавалася арганізаваць 3-класнае аддзяленне з 6-гадовым тэрмінам навучання на 42 месцы з гімназічным курсам навук (Закон Божы, мараль, чыстапісанне, маляванне, матэматыка, архітэктура, свяшчэнная і свецкая гісторыя, геаграфія, рыторыка, логіка, фізіка, філасофія, прыродазнаўства, міфалогія, аграномія, старажытнагрэчаская, лацінская, руская, польская, французская і нямецкая мовы). Прычым, тыя з іх, хто атрымаў бы дыплом аб "отлично-успешном окончании", маглі паступаць у Пецярбургскі ўніверсітэт. У сваю чаргу аддзяленне для дзяўчат мела больш вузкую вучэбную праграму (Закон Божы, мараль, чыстапісанне, маляванне, арыфметыка, свяшчэнная і свецкая гісторыя, геаграфія, прыродазнаўства, рукадзелле, руская, польская, французская і нямецкая мовы) і было разлічана на 21 вучаніцу. Таксама пры інстытуце меркавалася адчыніць прыходскае вучылішча для дзяцей тутэйшых сялян, дзе б яны вучылі напамяць катэхізіс, а таксама засвойвалі асновы рускай і польскай граматыкі, 4 арыфметычных правілы і пачатковыя звесткі па земляробству ды хатняй гаспадарцы. Для забеспячэння дзейнасці гэтых навучальных устаноў Ю. Шадурскі выдзяляў 12,5 тыс. руб. штогод (50 тыс. руб. асігнацыямі) з прыбыткаў фундуша Адамаў, Юстыніянаў, Дзедзін, Засцецын і Армей, якія знаходзіліся ў Себежскім павеце Віцебскай губерні [31, арк. 24 – 29].

Дадзеная прапанова 22 красавіка 1826 года разглядалася ў Вучоным камітэце Галоўнага ўпраўлення вучылішч у Пецярбургу і была ў цэлым адобрана. Міністр народнай асветы даслаў яе на зацвярджэнне ў Савет Міністраў, але той адразу адмовіўся яго разглядаць і 21 верасня гэтага ж года накіраваў дакумент на экспертызу міністру ўнутраных спраў "для предоставления по оному его мнения". У сваю чаргу апошні адзначыў, што неабходна правесці больш дэталёвае расследаванне, бо ў справе існуе два супрацьлеглых рашэння Полацкага Сумленнага суда (1796) і Віленскай фундушавай камісіі (1824). У выніку толькі рашэннем Сената ад 29 студзеня 1827 года была афіцыйна адобрана прапанова гаспадара Асвеі: "Предоставить уже всё с сей стороны Шадурскому на совесть и не возлагая на Правительство иной обязанности, кроме наблюдения, дабы учреждённые заведения не были противны общим постановлениям". Што ж датычыцца ўзнікшых супярэчанняў наконт рашэнняў азначаных вышэй устаноў, то тут справа вельмі зацягнулася, і толькі 27 лістапада 1833 года Сенат вырашыў прызнаць правамерным пастанову Полацкага Сумленнага суда, а адпаведны дакумент Віленскай фундушавай камісіі "уничтожить" [32, арк. 19, 30 – 32].

Не чакаючы завяршэння гэтай бюракратычнай цяганіны, Ю. Шадурскі па ўласнай ініцыятыве адкрыў у Асвеі мужчынскае місіянерскае вучылішча (выдзяляў не менш 6250 руб. срэбрам штогод). У 1830 годзе тут было 50 выхаванцаў, што жылі "небогато, но безопасно от всяких нужд". Звычайны тэрмін знаходжання ў ім вызначаўся ў 2 гады, пасля чаго няздольных юнакоў выключалі "чтобы они не заграждали пути могущим быть образованными", а апошніх пераводзілі да піяраў у Полацк ці да дамініканцаў у Валынцы. Пачала працу ў Асвеі і жаночая пачатковая школа, у якой мелася 20 стыпендый ад гаспадара мястэчка (выдзяляў не менш 1250 руб. срэбрам штогод). Тутэйшыя выхаванкі знаходзіліся пад наглядам сясцёр міласэрнасці і былі "также ограждены от всех недостатков и нужд". Шмат было зроблена і ў дачыненні да "богоугодных предметов". Таксама ў Асвеі з канца 1820-х гадоў пачалі працаваць: лазарэт для збяднелых людзей, "помещаемых пристойно как при осмотре, так и по нуждам их"; шпіталь на

60 ложкаў для “престарелых и увечных”; багадзельня на 45 месцаў. Для іх абслугоўвання былі наняты доктар, хірург, цырульнік, створана вялікая аптэка і “пристойная кухня” [33, арк. 12 – 13адв].

Разам з тым галоўная ідэя Ю. Шадурскага наконт заснавання “Института графа Гильзена” ў Асвеі, нягледзячы на прынцыповую згоду Пецярбурга, не знайшла належнага водгуку ў мясцовых чыноўнікаў. Спачатку бурлівыя падзеі 1830 – 1831 гадоў увогуле адклалі гэтую справу. Пасля ж падаўлення нацыянальна-вызваленчага паўстання гаворка аб асобнай навучальнай установе для каталіцкай моладзі ўжо ўвогуле не магла ісці. У 1833 годзе папячыцель Беларускай навучальнай акругі Г. Карташэўскі пісаў Ю. Шадурскаму, што ён згодны на заснаванне ў Асвеі свецкай сярэдняй школы, але з меншай, чым планавалася, колькасцю стыпендый для збеднелых шляхцічаў. Аднак ужо праз год вучылішчныя ўлады перадумалі і “раілі” мецэнату ўсе грошы ўкласці ў арганізацыю ў Полацку дзяржаўнага павятовага вучылішча [34, арк. 19].

У 1834 годзе ў Асвеі змяніўся гаспадар – пасля смерці бацькі яго справу працягнуў сын Ігнацій, які атрымаў бліскучую адукацыю ў Швейцарыі. Ён даў згоду на перавод усіх сродкаў у Полацк, але ў Пецярбургу ўжо вырашылі, што лепш было б арганізаваць у Віцебску пры мужчынскай гімназіі Шляхетны пансіён. Прычым абавязковай умовай яго адкрыцця было патрабаванне міністра народнай асветы С. Уварава закрыць Асвейскае місіянерскае вучылішча і Забяльскую дамініканскую гімназію. Наконт апошняй Г. Карташэўскаму з Пецярбурга пісалі асобна – яна “не соответствует нынешнему училищному плану и должна бы быть давно уже закрыта подобно прочим”, бо “раздвояет дух и направление воспитания”. Ігнацій Шадурскі быў вымушаны і на гэту “прапанову” ўлад пагадзіцца, але з пэўнымі агаворкамі. Па-першае, з 12,5 тыс. руб. срэбрам ён пераводзіў у Віцебск толькі 5 тыс. руб. на 40 стыпендый для збяднелых асоб, якіх асабіста будзе абіраць з ліку падаўшых заяву на залічэнне. Па-другое, у Асвеі застанецца працаваць жаночае пачатковае вучылішча сясцёр міласэрнасці з фінансаваннем у памеры 1250 руб. срэбрам штогод. Па-трэцяе, 2250 руб. срэбрам штогод будзе выдзяляцца на дзейнасць у Асвеі прыходскай школы для сялян. Па-чацвёртае, яго збяднелыя сяляне будуць атрымліваць штогадовую дапамогу ў памеры 2250 руб. срэбрам. Па-пятае, 1150 руб. срэбрам пойдзе на ўтрыманне ў Асвеі лазарэта, шпіталя і багадзельні. Кіраўніцтва Беларускай навучальнай акругі адобрыла меркаванні І. Шадурскага. У кастрычніку 1837 года з ім было падпісана афіцыйнае пагадненне аб пераводзе гільзенаўскага фундуша ў Віцебскую мужчынскую гімназію. Пры гэтым місіянерскую школу ў Асвеі закрылі адразу ж, а дамініканцам было дазволена завершыць цякучы вучэбны год; Забяльская гімназія канчаткова была ліквідавана ў чэрвені 1838 года, а яе маёмасць разрабавана [35, арк. 66].

Пры гэтым неабходна адзначыць, што ўзаемаадносіны рускіх улад і І. Шадурскага паступова змяняліся. Калі ў час паўстання 1830 – 1831 гадоў ён захаваў вернасць царызму, за што атрымаў званне камер-юнкера імператарскага двара, то ў 1840-я гады яго ўжо называлі адным з лідэраў антыўрадавай шляхецкай апазіцыі ў заходніх губернях – па звестках паліцыі граф падтрымліваў рэгулярныя кантакты з князем А. Чартарыйскім у Парыжы. Яго ж рэзідэнцыя ў Асвеі выглядала “хутчэй як сталіца ўдзельнага княства, чым рэзідэнцыя літоўскага пана” [36, с. 389]. У выніку ўлады імкнуліся як мага больш узмацніць уласны кантроль за размеркаванне фундушавых сродкаў. У 1843 годзе была створана спецыяльная Камісія для апекі і захавання фундуша Гільзенаў-Шадурскіх, якая ажыццявіла поўную рэвізію маёнткаў і ў 1845 годзе адзначала, што разам яны прыносяць штогадовы прыбытак у памеры 24 тыс. руб. срэбрам, але палова з іх сыходзіць на выплаты працэнтаў па розных пазыках гаспадара, а таксама на ўтрыманне адміністрацыі. З астатніх грошаў толькі 5 тыс. руб. срэбрам штогод ідзе на асвету – пры Віцебскай гімназіі быў утвораны “Канвикт Гильзенов-Шадурских” (узамен першапачаткова запланаванага Шляхетнага пансіёна). Грошы ж, выдзеленыя на адкрыццё прыходскай школы для сялян, а таксама на ўтрыманне жаночага вучылішча сясцёр міласэрнасці (зачынена ў 1843 г. згодна ўказу аб забароне каталіцкім ордэнам трымаць жаночыя пансіёны), ідуць выключна на дапамогу збяднелым сялянам [37, арк. 446 адв., 449, 459]. Разам з тым штосьці змяніць у гэтым Камісія была не ў стане з-за згаданага раней рашэння Сената 1827 года, які пакідаў усе справы “на совесть” гаспадароў фундуша. Так, напрыклад, у 1843 годзе С. Савіч, якая трымала ў Віцебску Узорны жаночы пансіён, прасіла папячыцеля Беларускай навучальнай акругі Я. Грубера перавесці ёй 1250 руб. срэбрам штогод з ліквідаванага Асвейскага жаночага вучылішча для ўтрымання на іх 10 шляхцянак (узамен 22 у Асвеі). Але І. Шадурскі выказаўся супраць: “Образцовый пансион по своему назначению… есть приличный для более достаточных дворянских дочерей – но для бедных был бы вовсе не свойственным, ибо получив высшее образование и возвратясь в недра бедных своих фамилий – привыкнув к лёгкой роскоши житья и более просвещённое имея обо всём понятие, не захотят жить долее разделяя скудный кусок хлеба или быть может содержать себя и родителей работая собственными руками на дневное пропитание – да и несчастные родители не будут знать, куда девать дочерей учёных, но отвыкших от трудолюбия и от неудобств бедности”. У заключэнні ж ён пісаў: “Я совестью обязан охранять способы, как доставлять сколь возможно большему количеству бедных дворянок воспитание, которое не отвлекая их мыслей ниже желаний обыкновенного быта”. У выніку вучылішчныя ўлады былі вымушаны пагадзіцца на адкрыццё ў Асвеі прыходскага вучылішча для дзяўчат [38, арк. 411, 420].

Такім чынам, замест таго каб на завешчаныя Я.А. ды Ю.Е. Гільзенамі каласальныя фінансавыя сродкі правесці сапраўдную асветніцкую рэформу ва Усходняй Беларусі, дзяржаўныя ўлады паціху зліквідавалі нават тое, што было зроблена. Усяго праз паўстагоддзе пасля знікнення гэтага слаўнага роду па сутнасці быў знішчаны і іх фундуш. Пры гэтым утвораны пры Віцебскай мужчынскай гімназіі канвікт Гільзенаў-Шадурскіх нельга разглядаць як штосьці вельмі важнае і істотнае ў справе пашырэння айчыннай асветы. Па-першае, ён быў разлічаны ўжо толькі на 40 выхаванцаў (10 – 15 % ад усіх). А па-другое, гэтыя грошы (у лепшыя гады сума даходзіла да 7 тыс. руб.) не аказвалі значнага ўздзеяння – ад дзяржавы штогод гімназія атрымлівала звыш 50 тыс. руб. Трэба праўда адзначыць, што Шадурскія (пасля смерці Ігнація ў 1853 годзе сродкамі распараджалася яго сястра Казіміра, а з 1856 года яе стрыечны брат Мікалай з сынам) працягвалі спробы нейкім чынам змяніць становішча. У 1845 – 1853 гадах для канвікта ў Віцебску быў набыты і адрамантаваны асобны будынак на Смаленскай вуліцы (каля касцёла св. Антонія). Верагодна, яны марылі аб утварэнні на яго базе неўзабаве новай навучальнай установы. Але і гэтыя захады былі рашуча адхілены гімназічным кіраўніцтвам – летам 1866 года дырэктар Віцебскай гімназіі Н. Арнольд дабіўся ў Пецярбургу дазволу на “рэарганізацыю” канвікта Гільзенаў-Шадурскіх у “агульную кватэру”, што азначала замену асобнага інтэрната з дадатковымі выкладчыкамі на звычайныя стыпендыі, якія размяркоўваліся з улікам пажаданняў гімназічнага кіраўніцтва паміж збяднелымі выхаванцамі [39, с. 138].

Пры такім развіцці падзей Шадурскія ўвогуле страцілі зацікаўленасць да справы пашырэння асветы. Ды і час ужо быў не той – развіццё капіталістычных адносін і хвалі рэпрэсій падарвалі магутнасць тутэйшай шляхты і знішчылі ў Беларусі дух дабрачыннага фундатарства, якім яна славілася ў перыяд існавання Рэчы Паспалітай. У новых умовах гаспадарання былыя гільзенаўскія маёнткі паступова пачалі прыходзіць у заняпад. З улікам гэтага сродкі ад Шадурскіх у Віцебскую гімназію сталі паступаць усё радзей. Такое становішча хвалявала шмат каго ў краі. Напрыклад, гісторык П. Стральцоў у 1903 годзе выступіў са спецыяльным дакладам аб гільзенаўскім фундушы на губернскім сельскагаспадарчым сходзе ў Дзвінску. Сярод іншага ў ім ён заклікаў улады змяніць свае адносіны да Беларусі ў цэлым і азначаных сродкаў у прыватнасці ды адчыніць на іх у рэшце рэшт у краі ўніверсітэт ці хаця б палітэхнічны інстытут [40, с. 17 – 19].

Здавалася, што для падобнага развіцця падзей ёсць усе падставы. У пачатку XX стагоддзя Міністэрства народнай асветы ўзбудзіла крымінальную справу супраць тагачасных уладароў Асвеі – братоў Мікалая і Івана Шадурскіх – наконт не выканання імі ўзятых на сябе дабрачынных абавязкаў. Рашэннем суда ў 1907 годзе былыя гільзенаўскія маёнткі перайшлі ў ведзянне казны, а Шадурскія былі вымушаны вярнуць недаплачаныя 200 тыс. руб. Але доўгачаканага адкрыцця вышэйшай навучальнай установы так і не адбылося. Палова сродкаў пайшла на будаўніцтва новага корпуса Віцебскай мужчынскай гімназіі і стыпендыі лепшым выхаванцам, а астатнія на арганізацыю ў горадзе рэальнага вучылішча, якое пачало сваю дзейнасць у кастрычніку 1911 года [41, арк. 1 – 13об.]. Першапачаткова яно мела падрыхтоўчы і 4 асноўныя класы (да 1916 г. адкрыты яшчэ тры) і знаходзілася на Гогалеўскай вуліцы ў арэндаваным у купца Пішчуліна будынку. На ўтрыманне вучылішча дзяржава выдзяліла 26 тыс. руб. штогод, бо працэнтаў з капіталаў Гільзенаў-Шадурскіх (3,3 тыс. руб. штогод) было яўна не дастаткова. Да 1917 года на чале гэтай навучальнай установы знаходзіўся вядомы гісторык У.К. Краснянскі, а ў штат вучылішча ўваходзілі 3 законанастаўнікі, 10 выкладчыкаў, памочнік класнага настаўніка, урач і дантыст. Сярод іх былі выпускнікі ўніверсітэтаў Пецярбурга, Кіева, Харкава, Казанскай праваслаўнай духоўнай акадэміі, Пецярбургскага гісторыка-філалагічнага інстытута, Віленскіх настаўніцкага яўрэйскага інстытута і вышэйшага Марыінскага вучылішча, Пензенскага мастацкага вучылішча, Магілёўскай праваслаўнай духоўнай семінарыі, Віленскага юнкерскага вучылішча і г. д. Вучылася ж у рэальным вучылішчы ў 1911 – 105 чалавек, 1914 – 178, 1915 – 227 [42, с. 83 – 84]. На жаль, пасля ўсталявання савецкай улады яно было рэарганізавана ў звычайную агульнаадукацыйную школу, а шматпакутны гільзенаўскі фундуш знік разам з прыватнай уласнасцю.

Заключэнне. Завершылася яшчэ адна старонка айчыннай гісторыі, якая пры іншых абставінах магла сусветна праславіць не толькі Асвею, але і ўсю Беларусь. Сапраўды, па аб’ёму капіталаў фонд Гільзенаў-Шадурскіх мала ў чым саступаў бы зараз знакамітай Нобелеўскай прэміі (пры належным кіраўніцтве). Прычым яго арыентацыя на развіццё асветы і сацыяльныя праграмы дазволіла б гэтым дабрачынным установам удала суіснаваць і гарманічна дапаўняць адзін аднаго. На жаль, падзеі пайшлі па іншаму кірунку, і зараз прозвішчы беларускіх “Нобеляў” практычна забыты. Застаецца толькі спадзявацца на тое, што ў далейшым сітуацыя зменецца і Ян Аўгуст ды Юзаф Ежы Гільзены яшчэ будуць атаясамлівацца з традыцыйнай беларускай дабрачыннасцю і міласэрнасцю, а ў адноўленым Асвейскім палацы Ганаровы камітэт калі-небудзь уручыць “Гільзенаўскія прэміі” ў розных галінах навукі і мастацтва.

ЛІТАРАТУРА

1. Каханоўскі, Г.А. Да пытання аб беларускім мецэнацтве ў XVI – XVIII стст. / Г.А. Каханоўскі // Беларусіка-Albaruthenica. Кн. 2: Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. – Мінск: Нац. нав.-асв. цэнтр імя Ф. Скарыны, 1992. – С. 101 – 105.

2. Скеп'ян, А.А. Развіццё мецэнацтва ў Вялікім княстве Літоўскім / А.А. Скеп'ян // Весці НАН Беларусі. – Сер. гуманіт. навук. – 2000. – № 2. – С. 62 – 66.
3. Kościałkowski, S. Z dziejow ofiarności na rzecz nauki i nauczania na Litwie / S. Kościałkowski // Nauka Polska: w 8 t. – Warszawa: Wyd-wo M. Arcta, 1925. – T. 5. – S. 241 – 296.
4. Łempicki, S. Opiekunowie kultury w Polsce / S. Łempicki. – Warszawa: PWKS, 1938. – 90 s.
5. Пазднякоў, В. Гільзены / В. Пазднякоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 6. Ч. 2. – Мінск: БелЭн, 2003. – С. 366.
6. Manteuffel, G. Księstwo Inflanckie XVII i XVIII stulecia. Przeglad wybitniejszych jego postaci / G. Manteuffel. – Kraków: Druk. W. Anczyca i Spółki, 1897. – 46 s.
7. Rostworowski, E. Hylzen Jan August / E. Rostworowski // Polski Słownik biograficzny. – T. 10. – Warszawa-Kraków: Wyd-wo PAN, 1962 – 1964. – S. 128 – 129.
8. Rostworowski, E. Hylzen Jerzy Mikołaj / E. Rostworowski // Polski Słownik biograficzny. – T. 10. – Warszawa-Kraków: Wyd-wo PAN, 1962 – 1964. – S. 130.
9. Слюнькова, И.Н. Монастыри восточной и западной традиций / И.Н. Слюнькова. – М.: Прогресс-Традиция, 2002. – 600 с.
10. Без-Корнилович, М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся / М.О. Без-Корнилович. – СПб.: Тип. 3-го отд. собственной его Имп. величества канцелярии, 1855. – 355 с.
11. Алісейчык, У.В. Манастырскі шпіталь / У.В. Алісейчык // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі / пад рэд. С.В. Марцэлева [і інш.]. – Віцебская вобл. – Мінск: БелСЭ, 1985. – С. 162.
12. Rostworowski, E. Hylzen Jan August / E. Rostworowski.
13. Бирало, А.А. Философские проблемы в науке эпохи Просвещения в Белоруссии и Литве / А.А. Бирало. – Минск: Изд-во БГУ, 1979. – 160 с.
14. Rostworowski, E. Hylzen Józef Jerzy / E. Rostworowski // Polski Słownik biograficzny. – T. 10. – Warszawa-Kraków: Wyd-wo PAN, 1962 – 1964. – S. 130 – 132.
15. Кулагін, А. Па колішніх маёнтках / А. Кулагін // Страчаная спадчына; уклад. Т.В. Габрусь. – Мінск: Беларусь, 2003. – С. 169 – 235.
16. Федорук, А.Т. Садово-парковое искусство Белоруссии / А.Т. Федорук. – Минск: Ураджай, 1989. – 247 с.
17. Manteuffel, G. Księstwo Inflanckie XVII i XVIII stulecia / G. Manteuffel.
18. Zielińska, S. Plater Kazimierz Konstanty / S. Zielińska // Polski Słownik biograficzny. – T. XXVI/4. – Z. 111. – Warszawa-Kraków: Wyd-wo PAN, 1987. – S. 665 – 672.
19. Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: в 12 т. / под общ. ред. П.П. Семенова. – СПб.: Тип. М.О. Вольфа, 1881 – 1901. – Т. 3: Литовское и белорусское Полесье / А.К. Киркор [и др.]. – 1882. – 490 с.
20. Ciechanowicz, J. Rody rycerskie Wielkiego Księstwa Litewskiego: w 5 t. / J. Ciechanowicz. – Rzeszów: FOSZE, 2001. – T. 5. – 2001. – 497 s.
21. Grzebień, L. Szadurski Stanisław / L. Grzebień // Polski Słownik biograficzny. – T. XLVI/3. – Z. 190. – Warszawa-Kraków: Wyd-wo PAN, 2009. – S. 392 – 393.
22. Haratym, A. Szadurski Jan / A. Haratym // Polski Słownik biograficzny. – T. XLVI/3. – Z. 190. – Warszawa-Kraków: Wyd-wo PAN, 2009. – S. 390 – 392.
23. Национальный исторический архив Беларуси в Минске (НИАБ в Минске). – Фонд 3157. – Оп. 1. – Д. 15. Переписка с Министерством народного просвещения, смоленским, витебским и могилёвским губернаторами об использовании фундуша гр. Гильзена, завещенного на воспитание бедных дворян при Забяльской доминиканской гимназии и переводе конвикта в Витебск, 1830 – 1849 гг.
24. НИАБ в Минске. – Фонд 2001. – Оп. 1. – Д. 3. Указы Сената. Предписания Министерства внутренних дел о сборе податей с евреев, об учреждении временной комиссии о военных училищах и др., 1805.
25. НИАБ в Минске. – Фонд 3157. – Оп. 1. – Д. 15.
26. НИАБ в Минске. – Фонд 2507. – Оп. 1. – Д. 1. Ведомости и отчёты о состоянии Забяльской гимназии и конвикта Гильзено-Шадурских за 1820 – 1829 гг.
27. Российский государственный исторический архив в Санкт-Петербурге (РГИА). – Фонд 733. – Оп. 62. – Д. 208. Дело о возведении Забяльского доминиканского училища в ранг гимназии, 1811 г.
28. РГИА. – Фонд 733. – Оп. 62. – Д. 516. Проект Забяльской доминиканской академии, 1820 – 1827 гг.
29. Сборник сведений о средних учебных заведениях Виленского учебного округа / под ред. Н. Сергиевского [и др.]. – Вильна: Тип. М.Р. Ромма, 1873. – 376 с.
30. НИАБ в Минске. – Фонд 3157. – Оп. 1. – Д. 15.
31. НИАБ в Минске. – Фонд 3157. – Оп. 1. – Д. 15.

32. НИАБ в Минске. – Фонд 3157. – Оп. 1. – Д. 15.
33. НИАБ в Минске. – Фонд 3157. – Оп. 1. – Д. 15.
34. НИАБ в Минске. – Фонд 3157. – Оп. 1. – Д. 11. Переписка с Министерством народного просвещения, курляндским губернатором, Витебской, Могилёвской и Гродненской дирекциями училищ о введении 5-классных училищ вместо 4-классных, преподавании иностранных языков, преобразовании Динабургского уездного училища в гимназию, 1835 – 1850 гг.
35. НИАБ в Минске. – Фонд 3157. – Оп. 1. – Д. 7а. Дело о проекте использования фундуша гр. Гильзена на устройство училищ в Витебской губ., 1829 – 1843 гг.
36. Makarewicz, W. Szadurski Ignacy / W. Makarewicz, E. Orman // Polski Słownik biograficzny. – T. XLVI/3. – Z. 190. – Warszawa-Kraków: Wyd-wo PAN, 2009. – S. 388 – 390.
37. НИАБ в Минске. – Фонд 3157. – Оп. 1. – Д. 16. Переписка с Министерством народного просвещения, смоленским, витебским и могилёвским губернаторами об использовании фундуша гр. Гильзена, завещенного на воспитание бедных дворян при Забяльской доминиканской гимназии и переводе конвикта в Витебск, 1830 – 1849 гг.
38. НИАБ в Минске. – Фонд 3157. – Оп. 1. – Д. 178. Дело о фундуше гр. Гильзена на содержании в Витебской гимназии детей бедных дворян, 1843 – 1844 гг.
39. Сапунов, А. Историческая записка 75-летия Витебской гимназии / А. Сапунов. – Витебск: Тип. Губернского правления, 1884. – 177 с.
40. Пічэта, У.І. Пытанне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым / У. І. Пічэта // Працы БДУ ў Менску. – 1928. – № 19. – С. 3 – 19.
41. НИАБ в Минске. – Фонд 2596. – Оп. 1. – Д. 22. Дело о доставлении разных сведений и срочных ведомостей и об открытии реального училища, 1911 – 1912.
42. Памятная книжка Виленского учебного округа за 1915 год. – Вильна: Тип. А. Сыркина, 1915. – 460 с.

Пастуніў 22.03.2011

FUNDS GILZENOV-SHADURSKIH IN BUSINESS OF A DEVELOPMENT OF EDUCATION IN EAST BELARUS OF THE END XVIII – THE BEGINNINGS OF THE XX-TH CENTERY

A. SAMUSIK

The scientific article is devoted a problem which remains till now behind frameworks of works of domestic and foreign researchers – histories of creation and use in school business of the end XVIII – the beginnings of the XX-th century of the largest in Belarus funds Gilzenov-Shadurskih. The historiography analysis has shown an insufficient level of scrutiny of patronage of arts in Rzecz Pospolita. With the account of it in work formation process funds against a political-economical life of the Belarus earths is tracked at this time. The analysis of archival sources has allowed the author to study comprehensively ways of distribution of means and their influence on position of separate educational institutions. Research of evolution of the relation of the authorities to private patronage of arts has given the chance to define specificity of development of an education system in region, and also the factors promoting its rapprochement with imperial school model. Became a subject of separate studying projects Shadurskih on transformation Oswei into the large cultural-educational centre. In the end of article necessity of revival funds Gilzenov-Shadurskih as the significant charitable action of the international level is noted.